БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары зд 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да д му у Мінску на 1 месяц 3 рублі,

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру(
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 7. Менск. Субота 30 сакавіка 1918 г. Год I.

Менск 29/III.

У чатыры кія

Вільня, агульная сталіца беларусаў і літоўцаў, с кавалкам нашай Віленшчыны як бы аддана Літве этнаграфічнай—Малой Літве.

Наша мілае Палессе з Рэчыцай, Пінскам, Лунінцом—ужо пад Украінай. Туды назначаны ужо украінскі губэрнатар—Скоропіеў--Елтухоўскі. У мінуўшчыну Беларусь перацягівалі да сябе дзьве моцныя рукі—Масква і Варшава, але наша зямля пападала пад уплыў гэтых імперыялізмаў цэлай, ні разрэзанай. Цяпер, за вайну вырас новы імпэрыялізм—мала—літоўскі і украінскі.

Мала-літоўскі імпэрыялізм лічыць Вільню сваею сталіцай хоць гэткія самыя правы, а нават і большыя, маем мы, беларусы, бо кругом гораду Гэдыміна жывуць скрозь беларусы, і толькі за 40 верст ад Вільні жывуць літвіны.

Вільня патрэбна і нам, і літоўцам. Трэба зрабіц Вільню вольным горадам, каторы будзе палітычным і культурным цэнтрам.

Шмат сталеццяў беларусы і літвіны жылі разам, цабрацку, згодна і добра, Мы цьвёрда верым, што так і цяпер будзе. «Ні трэба навіны, ніхай будзе старына»,—як пісалі «старцы валасьцей да Літоўскіх Вялікіх князёў калі «дзержаўцы» прысланыя у якую нібудзь бабруйскую валасьць з Вільні заводзілі парадкі ні пад густ «людзей».

Граніца Палесся ад Украіны 600 вёрст. Яна служыць разам і граніцай Міншчыны. Менязь яе ні можна. Экапамічна і палітычна Палессе цягнуло заўсёды да Слуцка, Менска.

Паляшукі—ні украінцы,—жыхары вольных стэпоў, мова іх адменная ад беларускай, але адменна і ад украінскай. Па быту, звычаям і традыцыям палешукі зжыліся з Міншчынай. У дрэўляніна-палешука і паляніна-беларуса складдушы. характар блізка сходзяцца.

Беларускаго імпэрыялізму німа і ні будзе. Палешук—гэта палешук, а ні беларус-палянін, або стэпавы «хахол».

Разумеем добра, што Палессе, як багаты лесам раіон, вельмі смачны гарэх, але ніведама іішчэ, каму ён дастанецца...

Беларускі Народны Сэкрэтарыят у сваей Устаўной Грамаце ад 24 сакавіка за Беларускай Рэспублікай прызнае толькі «беларускія часьці Міншчыны».

Ізноў дыплёматычная ігра на скуру палешука «за чары і за сьмех» кіеўскай Далілы, каторая у «фаворы пры двоыры» па разумению нашых дыплёматаў.

Чорнае золато.

Недалёка ад Мазыру—каля весак Макарычы і Лескаўцы, берагі рэкі Прыпяці зложаны с тоўшчы сланцоваго сухога цьвёрдаго торфу, найлепшаго у сьвеце гатунку.

Ен слаісты і лёгка колiцца на цэглы-брыкеты. Гэты гаручы сланец ідзець глыбока у зямлю, па ім цячэць Прыпяць, а над вадой—берагамі—падымаецца на 3-4 сажэні. Пад'езжаець барка пад берат, у пяць мінют малое дзіцяне навале яе дармовай чорнай энергіяй, падвозіць вадой пад фабрыку, каторая там павінна некалі быць, вале проста у печ і тысячы станкоў, машын пачынаюць круціцца, выраблядь тавары на мільёны людзей. Можна з гэтай фабрыкі перадаваць па дратох электрычную сілу і сьвет на 100 вёрст кругом. Па усіх мястэчках, вёсках, дварох—аж зіяець вечарам ад яркаго сьвету, і па хатах, і па вуліцах. Малатарні, сечкарні. пільні, воўначоскі, млынкі, помпы, цэнтрафугі, станкі такарные вясковых рамесьнікаў дастаюць танную сілу па топкіх дратох на слупах ад лясістых, з горнымі абрывамі берагоў палешукоўскаі рэкі-маткі Прыпяці. Ляцяць праз лясы і балоты, як шалёные вагончыкі электрычнай дарогі, віхрам мясуць з глухіх бедных і адсталых да гэтуль куткоў к станцыям і гораду сьвежае масла, харчы сельскіе для людзей. Дармовая чорная сіла іх імчыць.

Зажыло усё, закіпело, прачнулося!

Інструктар па культуры балот І. Авік, пішэць; Палесьсе маець такіе неаб'ятные абшары балотаў, (35711 кв. вёрст), такі мяккі і вільготны клімат што калі гэта Палесьсе трохі падсушыць канавамі, та стольки можна разгадаваць скаціны, што можна заваліць маслам усю Эўропу.

А цяпер:

Бедна хата мая:
І стаінь на гнаі,
І цячэць, і крывая...

Гэтаго чорнаго золата-торфу у Беларусі прырода разсеяла скрозь гібель, як ні у аднэй стране Эўропы.

Усе чужынцы дзівяцца: скольки нізачэпленнаго багацця натуры у вас беларусоў, якіе абшары балотаў, каторые маглі бы пракарміць і узгадаваць мільёны людзей. Насяленне можэ павялічыцца хоць у 10 раз і ваш край яго сытно пракорміць. Для гэтаго патрэбны тры рэчы: навука, навука і ішчэ раз навука.

А. Ула—у.

На беларускім шляху.

Беларускае Народнае Прэдстаўніцтво у Менску

Заседанне 28 сакавіка 1818 р.

Пасьля дакладаў сябраў Гадыцкаго-Цьвірко, Русецкаго і Алексюка пастаноўлена прыняць пад загад прэдстаўніцтва прытулак імяні сясьцер быўш. земскаго саюза на Захараўскай 13.

Прыпяцьце прытулка і старанне аб патрэбных на яго утрыманне коштах даручэна сябр. Р. Скірмунту і сьвящч. Кульчыцкаму.

У прытулку Знаходзіцца 36 дзяцей у веку ад 5 да 14 гадоў—немаль усе беларусы.

Каапатаваць ў склад камітэту сьвящч. Васюкевіча.

Даручыць грам. Скірмунту прасіць нямецкія улады аб дазволі склікаць на 25 берэзьня 1918 р. канфэрэнцыю беларускіх арганізацый, раздзеляючых погляды прэдстаўніцтва, выложаныя у яго дэклярацыі ад 26 сакавіка г. р.

Малітва бежанца-беларуса да Бога.

Божэ наш ласкавы, Божэ міласьцівы!
Боже наш ўшэхмоцны, Божэ літасьцівы!
Змілуйся вад намі—над Тваймі сынамі
Беднымі, бэздольнымі і Тваймі дачкамі!

Дай нам, Божэ, сілы да працы агульнай,
Памажы ў рабоце паміж нас успульнай;
Бацькаўшчыну вашу выратуй з няволі
Пашлі, Божэ, шчасьця і дай лепшай долі!

Два апошніх годы ў вопратках—абносках
Плакалі па сёлах, гарадох і вёсках
Усюды лілі сьлёзы: па пожнях, па нівах
Па шляхох далёкіх і родных магілах.

Многа сьлёз пралілі па Вялікай Расеі;
Плакалі ў дзень, ў ночы, ня меўшы надзеі
Вярнуцца ў край родны, бачыць свае нівы,
Чуць родную мову, меці льос шчасьлівы

Вярні зноў нас, Божэ, на сваю старонку,
Дай нам способ ўзяцца за саху, баронку,
Ды зьбяры нас, Божэ, ўсіх ў нашыя хаткі
У Беларусь—пад крыло нашай роднай Маткі!

Міхалко Маховенко.

Сакавіка 15 дня
1918 року
г. Менск Беларускі.

Слуцак, менск. губ.

У Слуцку 3-го сакавіка пачала выходзіць штодзенная газэта. «Родны Край». Зарганізованы, пасьля таго, як уцяклі бальшэвікі са Слуцку, Беларускі Нацыянальны Камітэт хацеў выдаваць газэту беларускую у сваёй роднай мове, але сустрэў вельмі многа перашкодаў: адна с паміж іх была заява нямецкае камэндатуры, што яна ні мае адпаведнага цэнзара, каторы разумеў бы па беларуску, Прыйшлося згадзіцца с тым. што палітычные артыкулы пісаліся па вялікарасійску, а хроніка і літэрацкі аддзел можна было пісаць па беларуску.

Слуцак быў адрэзаны ад усяго сьвату і больш як 3 тыдні не атрымоўваў ніякіх газэтаў. «Родны Край» пашоў шыбка і ў месці, і ў вёскі, але дзякуючы непаразуменням с польскім камітэтам і ні так з ім, як арганізацыяй, але з аддзельнымі «польскімі ероямі», каторые адразу ўзяліся за розгі, «Родны Край» на № 3 па распарджэнні нямецкай улады быў забаронены. Камэндант нямецкі заявіў. што палякі скардзяцца на газету, а ён нічога ні разумее, дык дзеля сьвятога спакою мусіць пайсьці на гэта і ў газэце забараніў пісаць усё, што датычыцца палітыкі, а памешчаць толькі тэлеграмы нямецкаго штабу. Нават хроніка забаронена.

Цяпер можа будзе лягчэй, бо пазволілі рабіць перадрук з газэт нямецкіх, а зноў жа можа і наш камэндант, пабачыўшы чы пачуўшы, што у Менску выходзяць беларускія газэты і іх ні забараняюць, згодзіцца і наш «Родны Край» пусьціць у сваёй роднай беларускай мове.

Р—і.

У Адэсе 22 сакавіка была нарада біржавога камітэту с аўстрыйскай гандлёвай дэлегацыяй:

Аўстрыйны цікавяцца насеннем і маталамі. У замен праз нескалькі тыдняў могуць даставіць машыны, хімічныя прадукты і шкло. Сюды паведамляюць аб разгроме курорта Гурзуф. Раілі пагром матросы. Пацярпела інтэлігенцыя і заможнейшыя людзі. Жыхары паразьбегаліся. У Сэвастопалі так сама чакаюць крывавых падзеяў. У Адэсу прыбывае дэлегацыя румын дзеля арганізацыі атправкі у Румынію бежанцаў і ратунку 65 дэпутатаў і сэнатараў вывезеных бальшэвікамі з Сэвастопалю і Феодосіі. Нямецкая газэта «Odessen Zeitnug» гаворыць, што дзякуючы палітыцэ Керэнскаго і Чэрнова с «таварышамі» мы стаім перад магчымасьцю голада на Украіне. Трэба прымусіць «таварышоў» працаваць, бо яны адвыклі ад гэтаго. Патрэбен цэлы рад заходаў, каторыя павінна рабіць нямецкая а ні украінская—надта слабавольная—ўлада каб направіць гаспадарку і уцячы ад голаду.

Весткі з Расеі.

ПЕЦЕРБУРГ. Старания савецкаго ураду каб дастаць для Вялікаросіі Сыбірскаго збожа мі удаліся, дзеля таго што усе быўшые у Сыбіру запасы хлеба скуплены Амэрыкай і Англіяй.

КІЕУ. Урад Украінскай Народнай Рэспублікі загадаў рабіць усе публічныя напісы па Украінску а так сама усе расійскія гэрбы і назвы вуліцаў заменіць украінскімі.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Служачым на лініі Л. Р. ж. д. нямецкае жалезна-дарожнае начальство з 25 сакавіка выдае авансы (акупац. грашыма). Праз два тыдні тым жэ служачым маюць быць выплачаны пэнсіі за сакавік і палову красавіка (марэц і апрэль).

Скарбовая Палата выдала наказ таргоуцам і прамыслоуцам зараз жэ пабраць у казначэйсцьве білеты і патэнты на 1918 год.

Гарадзкая Управа маніцца увясьці падаходны (да 8%) і кватэрны (да 50%) налогі, каб падмацаваць сваю пустую касу.

Рэгістрацыя салдатау у воінскаго начальніка с прычыны каталіцкаго Вялікадня 29 31 сакавіка і 1-га красавіка будзе толькі ад 9—1 г. дня.

Каталіцкі біскуп Лозінскі, назначаны у Менск, прыедзе сюды не раней Маю мес.

С паміж зарэгістравaушыхся салдатау у воінскаго начальніка тые, што ня хочуць ехаць у Расію, павінны, як вядома, залічыцца у нямецкія рабочыя дружыны (Деменцеуская вул. і Сярэбранка), дзе ім дадуць кватэру, харч і 1 марку платы. Гэткіх дружыннікау запісалося ужо каля 3000 чалавек.

Пяты эшалон на Украіну з вайсковымі дактарамі і іх сямействамі маніцца выехаць з Менску у пачатку красавіка.

Цана за хлеб з 28 вечарам дайшла да 2-х рублеу за фунт і то дастаць было трудна.

Вываз прадуктау і таварау з Менску рознымі спэкулянтамі стау агалечываць і без таго голы ужо Менск. Каб спыніць гэтые гешэфты назначана стража з міліцыі на усіх трактах: даугінаускім, барысаускім, ігумэнскім, койданоускім, ракаускім і старосельскім.

У «Беларускай Хаце» на конным пляцу (каля 3 часьці) часта іграе цяпер украінская труппа пад кірауніцтвам артыста Яг. Чухліба, каторую вельмі прыхільна вітаюць жыхары тэй часьці гораду. Ягомасьць Чухліб, як вельмі здольны артыста, лічыцца любімцам, як украінцау, так і беларусау, бачыушых яго на тутэйшай сцэні у ролях коміка. Падбор артыстау вельмі старанны; асабліва с паміж іншых адзначаецца артыстка Гордзіенко.

Галубок.

Заведуючы харчовым аддзелам пры управленні Л. Р. ж. д. Прэабражэнскі выехау на поудзень для закупкі харчоу служачым дарогі, бо даунейшые запасы усе ужо скончыліся і нат краму сваю зачынілі.

Цэнтральные склады У. З. С. на Ляхоуцэ у Кашарах перайшлі пад загад Губэрнскаго Камітэту У. З. С. і у хуткім часе пачнуць сваю працу. Немцы, як гэта выяснілася з гутаркі іх с прэдстауніком губ. камітэту Злобіным, ніякай перашкоды рабіць ня будуць.

Цэны на харчы кожны дзень ідуць у гару. За пуд жытняй мукі даюць 70 руб., 1 ф. масла—20 р., 1 ф. цукру 5—6 р., 1 ф. газы—5 р., алей—4 р. за фунтъ, хлеб—1 р. 70 к., звычайная каубаса 1 ф—3 с паловай р, с каніны—1 80 к. Цэны пры вакзалах трымаюцца ішчэ вышэйшыя.

Паміж камароускіх арэндароу зямелькі пана Ваньковіча пайшоу перапуд. Справа у тым, што за час вайны арэндары нічога ні плацілі, дык цяпер сабралася багата за імі нядоімкау (па 100—500 р.) і зразу усе заплаціць у цяперашніх часах вельмі трудна. Тымчасам знайшоуся нейкі п. Банькоускі, быушы заправіла гарадзкой управы, каторы «пастарауся» выдаць прыказ ад адміністрацыі арэнднай канторы Ваньковіча аб тым. што калі арэндары не заплацяць належнасьці, то іх пачнуць выселяць.

Што кантора п. Ваньковіча адпачыушы за увесь час вайны, рванула с капыта у скачку—дзівіцца німа чаго: прыслужнікау панскіх—род у нас ня зьвеуся, але сам п. Ваньковіч хіба агледзіцца, што ня час цяпер цісчуць і выкідаць людзей, асабліва тых, што і бяз таго німала выцярпелі ад уселякіх «таварышоу».

Аб заяве б. нач. дарожных работ пры X арміі а прапажы 8000 рубл. мы ужо пісалі 27, Цяпер прыходзіцца дабавіць, што справа там больш заблутана, чым яна здавалася с пачатку.

Рэч у тым, што нікаторые с паміж інжэнерау аддзелау атрымалі перад аккупацыяй краю для расплаты са служачымі і рабочымі па тысячау 30, 40, 50 і больш. І вось цяпер гэтые служачые і рабочые (а іх каля 6.000!) дарэмна абіваюць парогі кватэр быушых начальнікау і падначальнікау.

20.000 пудоу жыта для Менска маняцца на падводах прывесьці у хуткім часе з Бабруйскаго павету. Пазваленне на гэту дастауку ужо есьць у агента харчоваго камітэту—Валодзькі.

Новые гарадзніе судзьдзі разам с сэкрэтарыятам абойдуцца гораду 26.000 р. Горад падзеляны на шэсьць вучасткау (дауней было 5) і кожны судзьдзя буде мець камэру у сваім вучастку. Першы з'езд міравых судзьдзяу адбудзецца 2-га красавіка (апрэля).

Спісак выбраных судзьдзяу мы ужо падавалі: шэсьць іх—больш—менш знаных тутэйшых юрыстау, і толькі адзін п. Агіеускі—прэдседацель савета старшын рускаго грамадзкаго сабрання (б. чорнасоценнаго клюбу за часоу Шміта, Скрынчэнкі і Саланевіча).

Рэформа міліцы пачалася з 28-га сакавіка. Чыстка яе пачалася ад камісарау, іх памошчнікау і канчаючы „нізамі". На чале міліцыі стау нямецкі паліцмэйстар Огільві.

Найбольш зьвернута будзе увага на спауненне прыказау камэндатуры, гарадзкой управы, на абязпеку мення грамадзян ад грабежствау, на гарадзкіе парадкі і інш.

Угалоуная міліцыя застаецца даунейшая.

Рэгістрацыя салдатау павінна быць скончана у суботу—30-га сакавіка. Але, дзеля вялікаго наплыву рэгіструючыхся, тэрмін, бадай, ішчэ будзе адложэны на далей.

Пэнсіі служачым духоунай кансысторыі і яе членам, як і шмат дзе, не плацяць 3-ці ужо месяц. Усяго шчасьця, што есьць ішчэ змога жывіцца крыху на мейсцовыя эпархіяльныя срэдствы.

Крызыс у Народным Сэкрэтарыяце. Як мы чулі у зьвязку с абвешчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі ні залежнай з Сэкрэтарыяту мусяць выйсьці, нізгодныя з гэтай пастановай сэкрэтары: Макрэеу, (унутр. спрау), Злобін (вялікарускіх спрау), Белкінд (грашовых спрау), Гутман (без партфэля) і яшчэ двое, а якіх,—выясніцца у бліжэйшых дньох.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтва Т-ва «Зараня»

АБВЕСТКІ.

С прычыны ліквідацыі аддзелаў Усерасійскаго Земскаго Саюзу асвабадзілася ад работы шмат рожных спэцыялістаў: дактары, вэтэрынары, медыцынскіе фэльчары, фармацэўты, аграномы, бухгалтары, счэтаводы, мэханікі-слесары, цесляры, шаўцы і інш.

Бюро па рэгістрацыі безработных пры камітэці злучаных работнікаў У. З. С. просіць усіх, каму здарыцца патрэба працоўнікоў, зьвертацца проста ў Бюро па рэгістрацыі безработных—Прэабражэнская вул. 26, ход з вуліцы ад 10—2 гадз.

Расійскае т-во чырвонага крыжу, каб памагчы вайсковым расійскай арміі і беднейшым жыхаром гораду наладзіла амбулаторыю (Захарауская 8), дзе спэцыялісты-дактары даюць дарма парады на усякія хваробы ад 9—1 гадз. дня.

Завед. амбул. д-р **Вазнесенскі.**

Аб'яўленне

29 Сакавіка г. г.,—у Вялікую Пятніцу. 31 сакавіка і 1 красавіка г. г.—у дні Св. Уваскресення усе магазыны і гандлевыя завядзення павінны быць **зачынены** ад 10 гадзіны з рана за ўсе гэтыя дні.

Тэатры, кінематографы і іншыя увесяліцельныя завядзеньня забаронены. Распараджэнне гэта ні разыйходзіцца на нямецкіх ваенных.

За нівыпоўненне гэтаго прыказу будзя накладацца штраф на 200 марак с заменаю 6-ці тыднёым арэштам.

Менск 26/III 1918 г.

Месцовая Комэндантура.



Друкарня Я. А. Грынблата.